УДК 378

**Трафімчык Алена Мікалаеўна**
*Дзяржаўная установа адукацыі «Дзіцячы сад № 15 г. Слоніма», Слонім, Рэспубліка Беларусь, sad15s@mail.ru*

# ВЫХАВАННЕ ПАВАЖЛІВАГА СТАЎЛЕННЯ ДА ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ СВАЁЙ КРАІНЫ, НАРОДА СРОДКАМІ МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

У артыкуле адлюстраваны вопыт работы музычнага кіраўніка дашкольнай установы адукацыі па фарміраванню грамадзянска-патрыятычнай культуры. Артыкул раскрывае этапы і асаблівасці працы, а таксама эфектыўныя метады, формы работы па накірунку. Прызначана для музычных кіраўнікоў, выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, намеснікаў загадчыкаў па асноўнай дзейнасці, установ дашкольнай адукацыі.

**Ключавыя словы:** музычная дзейнасць; эфектыўныя метады і прыёмы; музычны фальклор; культурная спадчына.

**Trofimchik Elena Nikolaevna**
*State educational institution "Kindergarten No. 15 Slonima", Slonim, Republic of Belarus, sad15s@mail.ru*

# FOSTERING RESPECT FOR THE HISTORY AND CULTURE OF YOUR COUNTRY AND PEOPLE BY MEANS OF MUSICAL FOLKLORE

The article reflects the experience of the music director of a preschool educational institution in the formation of a civic and patriotic culture. The article reveals the stages and features of the work, as well as effective methods and forms of work in the field. It is intended for music directors, preschool educators, deputy heads of core activities, and preschool education institutions.

**Key words:** musical activity; effective methods and techniques; musical folklore; cultural heritage.

Рэпазіторый БарДУ

**Уводзіны.** Зацікаўленнасць гісторыяй роднага краю, абрадамі і звычаямі беларускага народа, любоў і павагу да сваёй мовы патрэбна выхоўваць з маленства. Маленькім дзецям яшчэ недаступныя ў поўным прадстаўленні паняцці аб Радзіме, але ў раннім дзяцінстве зараджаецца любоў да яе. Ад таго, што бачыць дзіця з ранняга ўзросту, залежыць фарміраванне яго свядомасці і адносін да наваколля. Авалодваючы мовай свайго народа, яго звычаямі, дзеці атрымоўваюць першае прадстаўленне аб культуры. [1, с. 3]

**Асноўная частка.** У дзяржаўнай установе адукацыі "Дзіцячы сад № 15 г. Слоніма" шмат увагі надаецца далучэнню дзяцей да культурной спадчыны беларускага народа.

Ужо с першай малодшай группы перш за ўсё, мы праслухоўваем і праігрываем з дзецьмі беларускія народныя калыханкі, да якіх далучаюцца адпаведныя зместу дзеянні, такія як закалыхванне лялек, падпяванне. Н. Гілевіч пра калыханку сказаў: "Слухаючы такую песню — гэту адвечную песню матчынай любві, міжволі думаем, можа быць мінавіта адсюль, вось з такой калыханкі, з яе самай простай і геніяльнай на зямлі мелодыі і пачынаецца чалавек.

Па характару яны звычайна спакойныя. Асноўнае прызначэнне калыханак накіравана на тое, каб супакоіць дзіця. Народ здаўна разумеў, што выхаванне дзіцяці — справа сур'ёзная, і пачынаць яе трэба з маленства. У старэйшым узросце дзеці слухаюць беларускія народныя песні: "Перапелачка", "Рэчанька" (сярэдняя группа), дзе апяваецца прыгажосць беларускай зямлі, рэк, жывых істот. Больш абшырны рэпертуар беларускіх песень, мелодый для старэйшай группы ("Крыжачок", "Лявоніха", "Весялуха", "Трасуха"), гэты рэпертуар мае прынцыповае значэнне для фарміравання асноў музычнай культуры. Узровень развіцця ў выхаванцаў ацэньваецца па выказваннях аб настроі характара музыкі, уменню вылучаць жанр твора, разумець яго фунцыянальнае прызначэнне.

Творы, якія займаюць дзяцей сваім паэтычным, моўным зместам: дзіцячыя папеўкі, песні, звернутыя да сонца, дажджу, птушак. У пеўчай дзейнасці выкарыстоўваю папеўкі: "Божая кароўка", "Ладкі ладком", "Гушкі, гушкі прыляцелі птушкі". Вось адна із іх: *"Кую, кую ножку, паеду ў дарожку, куплю чаравічкі — малы, невялічкі"*. Да твораў далучаюцца адпаведныя зместу дзеянні і рухі. Выконваючы просты напеў, які складаецца з адной-дзвюх нот, дзеці развіваюць пачуццё рытму, вучацца ўзмацняць гучанне на моцных долях такта, разумець і адчуваць характар музычных твораў. З дапамогай беларускіх народных песень "Ой вясна, вясна", "А мы грушку садзілі", "Зайграй жа мне дударочку" развіваю ладавае чуццё, навыкі чыстага інтанавання гукаў, яны багаты добрым гумарам, аптымізмам і энергіяй беларускага народа.

Асноўны метадычны прынцып якім я кіруюся пры рабоце над песняй — гэта прастата і даступнасць вызначаннага матэрыялу, паслядоўнасць і сістэматычнасць пры вывучэнні, выразнае выкананне, суправаджэнне спеваў паказам цацак або малюнкаў. Поспех і трываласць засвоеннай песні залежыць ад таго, наскольki яна зразумелая дзецям. Такім чынам музычны матэрыял выкарыстоўваю з улікам індывідуальных асаблівасцей развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту, а таксама патрабаванняў вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Галоўны крытэрый, якім я кіруюся пры падборы музычнага матэрыялу — прадугледжванне вакальных магчымасцей дзіцячага голасу.

© Трафімчык А. М., 2024

Дзеці набываюць сацыяльны вопыт у паўсядзённым жыцці праз беларускія народныя гульні (“Верабей”, “Буслік”, “Журавель”, “Дожджык”, “Грушка” і інш.), дзе дзеючымі вобразамі паўстаюць жывыя істоты, якім надаюцца чалавечыя здольнасці[2, с. 24]. Дзеці вучацца самастойна знаёміцца з навакольным светам, перадаюць вобразы: коціка, бусліка, і іншыя. Пры выбары ролі выкарыстоўваю лічылкі: “Адзін, два, тры, чатыры — воўка грамаце вучылі, не чытаць, не пісаць, а сяброў выбіраць”.

У музыкальна рытмічнай дзейнасці выкарыстоўваю беларускія народныя танцы “Трасуха”, “Лявоніха”, “Дудалка”. Пашыраю веды аб беларускіх народных музычных інструментах (скрыпка, дудачка, цымбалы, гармонь). Дзеці іграюць у аркестры беларускую народную музыку (“Полька Янка”, “Бульба”).

Народныя святы і абрады садзейнічаюць далучэнню да розных відаў мастацтва, творчай дзейнасці і працоўных працэсаў. Патрэбна памятаць, што ў нашы дні няма натуральнага пераймання фальклору ад старэйшых, таму той фальклор, які быў спрадвеку ў дарослых, дзяцей уводзім штучна. Больш поўна дзеці набываюць сацыяльны вопыт праз актыўны ўдзел у народных святах, дзе ярка адлюстраваны традыцыі і абрады беларускага народа. У святочнай дзеі выкарыстоўваецца сукупнасць песеннай, танцавальнай, інструментальнай творчасці народа. Песні ўводзілі ў абрады і звычаі, якія ствараліся народам і станавіліся традыцыйнымі перш за ўсё ў паўсядзённым жыцці, дзеці арганічна і паслядоўна ўваходзяць ў народнае асяроддзе праз удзел у народных святах [2, с. 17]. Пры далучэнні да беларускага фальклора абавязкова ўлічваю ўзроставыя асаблівасцідзяцей, і знаемлю са святамі, якія больш зразумелыя дзецям (гэта датычыцца і абрадавых дзеянняў, гульняў, танцаў, песняў, якія выконваюцца на тым ці іншым свяце).

Традыцыйным святам у нашым дзіцячым садку з’яўляюцца “Калядкі”, у якім удзельнічаюць дарослыя і дзеці. Абавязковымі героямі свята традыцыйна становяцца Музыка, Зорканоша, Цыганка, Мядзвезь, Механоша, Каза. Калядоўшчыкі спяваюць шчадроўкі, разам з дзяцьмі водзяць карагод, гуляюць у народныя рухомыя гульні, танцуюць.

Народнае свята “Масленіцца” — гэта першае вясновае свята ў гонар сонца. На масленіцу спяваем песні, гукаем масленіцу, катаемся на санках, гуляем ў снежкі, спаборнічаемся між сабою ў спрыцы, частуемся блінамі.

22 сакавіка адзначаем свята “Прылёт птушак” (Саракі). Лічыцца, што ў гэты дзень да нас прылятае 40 птушак, і сярод іх — жаваранак. Разам з дзяцьмі вырабляем з паперы маленькіх птушачак, гуляем з імі, спяваем песні , упрыгожваем імі галінкі дрэў. Дзеці гукаюць вясну заклікаюць яе песнямі “Жавароначчкі, прыляціце”, удзельнічаюць у музычных гульнях: “Да деда ў госці”, “Дожджык”, “Журавель”, “Буслік” і іншыя.

На працягу года з выхаванцамі праводзім забавы: “У гасцях у Бабулі Загадулі”, “Прыляцелі птушачкі-пяюшачкі”, “Восенскі кірмаш”, літаратурна- музычная гасцеўня “Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына…”.

**Заключэнне.** Немагчыма ўявіць сабе культурнага і шырокаадукаванага сучаснага чалавека, які б не ведаў гісторыі, звычаяў і абрадаў, мовы свайго народа, не меў спагадлівых, беражлівых адносін да свайго мінулага, зацікаўленнасці ў набыцці гістарычных, краязнаўчых, этнаграфічных, моўных ведаў [3, с. 4].

Культурная спадчына беларускага народа вельмі багата і разнастайна цікавымі нацыянальнымі песнямі, танцамі, традыцыямі, звычаямі, народнымі святамі, якія увасабляюць жыцце чалавека, яго клопаты і быт. Менавіта выкарыстоўваючы патэнцыял беларускага фальклору з маленства можна ў поўнай меры раскрыць дзіцяці непаўторнасць, багацце і хараство роднага краю, узрасціць у дзіцячай душы насенне любові да роднай прыроды, гісторыі і культуры краіны.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Далучэнне дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры / склад.: Н. У. Зайцава [і інш.]. — Мазыр, 2002. — 30 с.
2. *Анцыпіровіч, В. М.* Фарміраванне музычнай культуры дашкольнікаў сродкамі беларускага фальклору / В. М. Анцыпіровіч. — Мінск : Зор. верасень, 2007. — 60 с.
3. Беларускі дзіцячы фальклор / склад.: А. М. Аляхновіч [і інш.]. — Мінск : Беларусь, 1994. — 290 с.


УДК 373.2:613.954

**Филипович Нина Викторовна**
*Государственное учреждение образования «Дошкольный центр развития ребёнка № 2 г. Лиды», г. Лида, Республика Беларусь, dcrr2-lida@mail.lida.by*

## АКТИВНЫЙ ОТДЫХ КАК СРЕДСТВО ФОРМИРОВАНИЯ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА ПОТРЕБНОСТИ В ФИЗИЧЕСКОМ САМОСОВЕРШЕНСТВОВАНИИ

В статье раскрывается потенциал активного отдыха в процессе формирования у детей старшего дошкольного возраста потребности в физическом самосовершенствовании.

**Ключевые слова:** активный отдых; обогащение и совершенствование двигательного опыта; физическое самосовершенствование.

© Филипович Н. В., 2024



Репозиторий БарГУ